КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДПУ
_______________А.В.Макоўчык
«06» __________ 2020 г.
Рэгістрацыйны № УД-30-01-70-2020/вуч.

# СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
(па выбары студэнта)
для спецыяльнасці:
1-03 01 07 Музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія

2020 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-03 01 07 па спецыяльнасці 1-03 01 07 Музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія, № 87 ад 30.08.2013 і вучэбнага плана па спецыяльнасці

СКЛАДАЛЬНІК:
Ю.Ю.Захарына, загадчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка", доктар мастацтвазнаўства, дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:
Кафедрай тэорыі і методыкі выкладання мастацтва
(пратакол № 11 ад 21.05.2020 г.);
Загадчык кафедры Ю.Ю.Захарына

Саветам факультэта эстэтычнай адукацыі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 12 ад 02.06.2020 г.)
В.а. дэкана факультэта І.Э.Цішкевіч

Метадыст вучэтна-метадычнага аддзела БДПУ
_________ А.А.Краўчанка

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Пры вывучэнні пытанняў сусветнай мастацкай культуры неабходна тэарэтычная база для павышэння ўзроўню кампетэнтнасці будучых настаўнікаў. Вучэбная дысцыпліна “Сусветная мастацкая культура” знаёміць студэнтаў з тэарэтычнымі асновамі мастацкай культуры, разглядае сукупнасць каштоўнасцей, створаных у розных відах мастацтва (выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, архітэктуры), як арганічнае адзінства ў яго супастаўленні з агульна-гістарычным працэсам развіцця чалавецтва. Падчас вывучэння дысцыпліны асобая ўвага звяртаецца на супольнасць прынцыпаў творчасці ў розных відах мастацтва, узаемасувязь відаў і жанраў мастацтва ў розныя гістарычныя перыяды, цэласнасць і своеасаблівасць мастацкай культуры розных эпох і народаў. Выкладанне дысцыпліны прадугледжвае інтэлектуальнае, маральнае і эстэтычнае развіццё; выпрацоўку ўласнага светапогляду, спосабаў і форм зносін паміж людзьмі; выхаванне любві да мастацтва. У працэсе вывучэння эвалюцыі сусветнай мастацкай культуры ў разнастайных цывілізацыях, грамадствах, народах, студэнты атрымліваюць абагуленнае ўяўленне аб мадэлі развіцця і трансфармацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей, працэсаў, мастацка-вобразных сістэм.

За апошнія гады мастацтвазнаўства і культуралогія ўзбагаціліся новым зместам. Маштабныя даследаванні, звязаныя з праблемамі стылю, мастацкага вобраза, кампазіцыі, ансамбля, каларыстыкі, дазволілі вылучыць найбольш істотныя і значныя аспекты ў галіне сусветнай мастацкай культуры, вызначылі канцэпцыі і метадалогію вывучэння мастацкай культуры, далі цэласнае ўяўленне аб гісторыі развіцця мастацтва ад вытокаў да сучаснасці.

## Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны

**Мэта вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Сусветная мастацкая культура”** – павышэнне ўзроўню гісторыка-мастацкай кампетэнтнасці студэнтаў.

**Задачы**:

1. авалоданне студэнтамі мастацтвазнаўчай тэрміналогіяй;
2. асваенне студэнтамі ведаў аб эвалюцыі мастацкіх стыляў, кірункаў, іх характэрных асаблівасцях, аб творчасці буйнейшых мастакоў, архітэктараў свету;
3. фарміраванне навыкаў аналізу мастацкіх твораў;
4. развіццё ўменняў вылучаць традыцыйныя і наватарскія рысы ў мастацтве асноўных гістарычных перыядаў.

## Патрабаванні да асваення вучэбнай дысцыпліны

Патрабаванні да ўзроўню засваення зместу вучэбнай дысцыпліны “Сусветная мастацкая культура” вызначаны адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-03 01 07 Музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Сусветная мастацкая культура” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.

Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый.

Студэнт павінен:

-АК-5.Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

-АК-8.Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

-АК-9.Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый.

Студэнт павінен:

-СЛК-3.Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

-СЛК-4.Валодаць навыкамі здароўезберажэння.

Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый.

Студэнт павінен быць здольным:

-ПК-1.Кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчай дзейнасцю навучэнцаў.

-ПК-2.Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

-ПК-3.Арганізоўваць і праводзіць навучальныя заняткі розных відаў і формаў.

-ПК-4.Арганізоўваць самастойную працу навучэнцаў.

-ПК-11.Развіваць навучальныя магчымасці і здольнасці навучэнцаў на аснове сістэмнай педагагічнай дыягностыкі.

-ПК-12.Развіваць навыкі самастойнай працы навучэнцаў з вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай і інш. крыніцамі інфармацыі.

-ПК-13.Арганізоўваць і праводзіць карэкцыйна-педагагічную дзейнасць з навучэнцамі.

-ПК-14.Папярэджваць і пераадольваць непасьпяховасць навучэнцаў.

-ПК-15.Фармуляваць адукацыйныя і выхаваўчыя мэты.

-ПК-16.Ацэньваць навучальныя дасягненні навучэнцаў, а таксама ўзроўні іх выхаванасці і развіцця.

-ПК-17.Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыя і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.

-ПК-18.Арганізоўваць цэласны адукацыйны працэс з улікам сучасных адукацыйных тэхналогій і педагагічных інавацый.

-ПК-19.Аналізаваць і ацэньваць педагагічныя з’явы і падзеі мінулага ў святле сучасных навуковых ведаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Сусветная мастацкая культура” студэнт павенен

**ведаць:**

- мастацтвазнаўчую тэрміналогію;
- асноўныя стылі, кірункі мастацтва і іх характарыстыку;
- віды, жанры, тэхнікі мастацтва;

- творчасць буйных архітэктараў, скульптараў, графікаў, жывапісцаў, мастакоў прыкладной творчасці;

- асноўныя тэндэнцыі развіцця сусветнай мастацкай культуры.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

**умець:**

- характарызаваць стылі і кірункі мастацтва;

- аналізаваць мастацкія творы;

- вылучаць традыцыйныя і наватарскія рысы ў мастацтве асноўных гістарычных перыядаў;

- схематычна выяўляць элементы твораў мастацтва.

**валодаць**:

-прыёмамі славеснага ўяўлення біяграфій і творчасці выдатных прадстаўнікоў сусветнай мастацкай культуры.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны “Сусветная мастацкая культура” вызначана на аснове тэматычнага падыходу. Пералік асноўных тэм прыведзены ў вучэбна-метадычнай карце.

для студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі адведзена ўсяго 158 гадзін, з іх 72 гадзіны аўдыторных заняткаў (52 лекцыйных, 20 семінарскія). На самастойную работу студэнтаў вылучана 50 гадзін. Для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі адведзена ўсяго 158 гадзін, з іх 16 гадзін аўдыторных заняткаў (12 лекцыйных, 4 семінарскія).

Аўдыторныя гадзіны для дзённай формы атрымання адукацыі размяркоўваюцца наступным чынам:

2 курс 3 семестр – усяго 32 гадзіны (з іх 24 лекцыйных + 8 семінарскія);

2 курс 4 семестр – усяго 18 гадзін (усе 12 лекцыйныя + 6 семінарскія);

3 курс 5 семестр – усяго 22 гадзіны (з іх 16 лекцыйных + 6 семінарскія).

Аўдыторныя гадзіны для завочнай формы атрымання адукацыі размяркоўваюцца наступным чынам:

3 курс 5 семестр – усяго 6 гадзіны (з іх 4 лекцыйных + 2 семінарскія);

3 курс 6 семестр – усяго 4 гадзіны (усе 4 лекцыйныя);

4 курс 7 семестр – усяго 6 гадзін (з іх 4 лекцыйных + 2 семінарскія).

Бягучая атэстацыя праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці дзённай формы атрымання адукацыі ў форме экзамену ў 5 семестры, у форме заліку ў 3 семестры, завочнай формы – у форме экзамену ў 7 семестры, у форме заліку ў 5 семестры.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Тэма 1. Гісторыя і тэорыя мастацкай культуры

Культура і яе функцыі ў грамадстве. Віды і тыпы культур: разнастайнасць падыходаў да класіфікацыі. Паняцце "мастацкай культуры".

Мастацтва як спосаб адлюстравання рэчаіснасці і форма грамадскай свядомасці. Віды і жанры мастацтва і іх характарыстыка. Мастацкі вобраз. Паняцце стылю ў мастацтве. Стылі і накірункі мастацтва і іх агульная характарыстыка. Кампазіцыя ў мастацтве. Традыцыі і канон ў мастацтве. Мастацкая форма. Тэхнікі мастацтва. Мастацтвазнаўства як навуковая дысцыпліна. Функцыі мастацтва. Аналіз мастацкага твору.

Мастацтвазнаўчая літаратура. Гістарыяграфія.

## Тэма 2. Мастацтва першабытнага грамадства

Паходжанне мастацтва. Роля працоўнай дзейнасці, звычаяў і абрадаў у станаўленні мастацтва. Перыядызацыя першабытнай культуры: Каменны век (палеаліт, мезаліт, неаліт), Бронзавы век, Жалезны век. Агульныя асаблівасці мастацтва. Паняцце сінкрэтызму. Пячорныя роспісы (Альтаміра ў Іспаніі, Ляско, Фон-дэ-Гом у Францыі) і іх адметныя рысы. Узнікненне жылля. Мегалітычная архітэктура: дальмены, менгіры, кромлехі. Першабытная скульптура. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

## Тэма 3. Мастацтва Старажытнага Усходу і Пярэдняй Азіі

***Старажытны Егіпет.*** Перыядызацыя гісторыі культуры. Старажытнае царства, Сярэдняе царства, Новае царства і мастацтва Амарны. Грамадска-палітычнае жыццё: рабаўладальніцкі строй, з'яўленне класаў. Узнікненне пісьменнасці і рамёстваў. Архітэктура і скульптура як вядучыя віды мастацтва.

Піраміды Старажытнага царства. Піраміды Хеопса, Хефрэна і Мікерына. Будаўніцтва скальных грабніц у перыяд Сярэдняга царства. Культавыя пабудовы Новага царства: храм царыцы Хатшэпсут у Дэйр-Эль-Бахры; Луксорскі і Карнакскі храмы; Рамессеум. Асноўныя прынцыпы планіроўкі, асаблівасці архітэктурна-прасторавай кампазіцыі, аздабленне.

Егіпецкі канон і яго адлюстраванне ў рэльефе, аб'ёмнай скульптуры і жывапісу. Развіццё партрэтнага мастацтва ў скульптуры і жывапісу. Сфінкс Хефрэна, статуі Рахатэпа і яго жонкі Нафрэт, скульптурныя партрэты Ніферціці, рэльефы ў Мемфісе. Парушэнне канону ў мастацтве ў перыяд Амарны.

Дасягненні ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Разнастайнасць матэрыялаў і тэхнік. Вырабы з каменю. Дэкаратыўныя роспісы (манументальныя і кніжная мініяцюра). Гліняная і фаянсавая кераміка. Вырабы з сіняга шкла. Ювелірнае майстэрства. Апрацоўка металаў. Вырабы з дрэва і слановай касці. Егіпецкая тканіна.

***Старажытная Месапатамія.*** Асаблівасці культуры. Асноўныя этапы ў развіцці мастацтва. Уплыў рэлігійнага светапогляду на мастацкую творчасць.

Асаблівасці прасторавай кампазіцыі ў архітэктуры. Храмавыя пабудовы – Зіккураты. Вавілонская вежа. Палацавыя комплексы. Палац Ашурбаніпала ў Ніневіі, палац Саргона II у Хорсабадзе. Палац вавілонскага цара Навуходанасора II. Вісячыя сады Сіміраміды. Вароты багіні Іштар у Вавілоне.

Імітацыя ў скульптуры гліняных прыёмаў. Рэльефы палаца Ашурбаніпала. Разьба па камяню. Партрэтныя выявы цароў. Апрацоўка металаў. Ювелірнае майстэрства. Тэксціль.

***Старажытная Індыя.*** Дзяржаўная структура і народанасяленне. Рэлігійнае становішча. Агульная характарыстыка мастацтва.

Культавая архітэктура двух тыпаў: Ступы і пячорныя храмы Чаіцы. Асаблівасці архітэктурна-прасторавай кампазіцыі, аздабленне пластычным рэльефам. Ступа ў Санчы.

Фрэскавы жывапіс. Выявы святочных шэсцяў і цэрымоній, бытавых сцэн. Чалавек як галоўны аб’ект выявы. Асаблівасці жывапіснай тэхнікі.

Дэкаратыўная скульптура і яе ўпрыгожванне буйнымі ажэрэльямі, завушніцамі з золата і срэбра. Тэхнічныя прыёмы аздаблення: насечка, чыканка, філігрань, інкрустацыя, перагародчатая. Кераміка. Вырабы з бронзы: дробная пластыка і зброя.

***Старажытны Кітай.*** Перыядызацыя і агульныя асаблівасці мастацтва. Уплыў Індыі і Ірана. Дынамізм, стылізацыя, тэма прыроды ў мастацтве. Сімвалізм.

Кананізаванасць у архітэктуры Кітая. Вялікая Кітайская сцяна: этапы ўзвядзення, асаблівасці канструкцыя. Жыллё з яруснымі дахамі як правобраз архітэктуры культавага і грамадскага прызначэння. Два тыпы жылля: паўночны (з глухімі вонкавымі сценамі і памяшканнямі, звернутымі да ўнутранага двара), паўднёвы (у выглядзе павільёна). Горадабудаўніцтва. Рэгулярная сістэма планіроўкі.

Жывапіс. Вертыкальныя і гарызантальныя світкі. Узнікненне кітайскага пейзажу “горы і воды”. Мастацтва каліграфіі.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Керамічныя вырабы з шэрай і белай гліны. Шкло. Ювелірнае майстэрства. Багацце арнаментацыі ў бронзавых вырабах. Дзве асноўныя канструкцыі мэблі: сундук-лар і агалены каркас. Вырабы са слановай касці. Ткацтва (шоўк, дывановая тканіна, вышыўка).

***Старажытная Японія.*** Асаблівасці мастацтва: элітны мастацкі густ, любоў да прыроды, асіметрыя ў дэкоры, паўтарэнне матываў, адсутнасць перспектывы. Уплыў рэлігійных вераванняў на мастацкую культуру. Перыядызацыя мастацкай культуры.

Культавая архітэктура. Будаўніцтва храмаў Сінта. Будыйскія храмы пагады. Развіццё круглай скульптуры. Скульптурны партрэт. Апрацоўка металаў: бронзавыя і жалезныя вырабы. Ткацтва (лён, канопля, кітайскі шоўк). Асноўны тып адзення – касадэ. Тэракотавая скульптура і глазураваная кераміка.

***Старажытны Іран.*** Перыядызацыя гісторыі мастацтва: дынастыя Ахеменідаў, Парфянскае царства, дынастыя Сасанідаў. Рэлігійныя вераванні: маздэізм, зараастрызм, маніхейства.

Будаўніцтва царскіх грабніц двух тыпаў: з двухсхільным дахам і ў выглядзе вежаў. Грабніца першага магутнага цара Кіра. Купальныя грабніцы. Грамадская архітэктура. Рэзідэнцыя Дарыя I – Персеполь: асаблівасці архітэктурна-пrasторавай кампазіцыі, аздабленне. Будаўніцтва жылля і палацавых комплексаў у перыяд Парфянскага царства. Імкненне да сіметрыі і рэгулярнасці як характэрная асаблівасці архітэктуры. Палацавае дойлідства ў часы Сасанідаў. Купальная і арачная канструкцыі.

Глазураваная кераміка. Сіняя, белая і зялёная кафля: яе прызначэнне. Ювелірнае майстэрства і бронзавыя вырабы. Зааморфны арнамент у ткацтве: шаўковыя, шарсцяныя і дывановыя тканіны.

***Старажытная Карэя.*** Асаблівасці геаграфічнага размяшчэння. Будызм, канфуцыянства, даосізм. Уплыў Кітая на архітэктуру і жывапіс Карэі. Перыядызацыя мастацтва.

Першыя неалітычныя паселішчы. Асаблівасці жыллёвай архітэктуры. Будаўніцтва дальменаў. Росквіт грабенчатай керамікі ў ранні перыяд.

Утварэнне трох буйных дзяржаў у IV – VI стст.: Кагурё, Пэкчэ, Сілла. Горадабудаўніцтва і архітэктура. Храмавыя і палацавыя комплексы. Узвядзенне пахавальных склепаў знаці. Грабніца Мічхон-вана. Манументальныя роспісы грабніц. Пахавальнае начынне. Скульптура будыйскіх манастырскіх комплексаў – Ібуллан, Чхомунса, Мірыкса.

***Старажытная Манголія.*** Асаблівасці мастацтва: уплыў народных традыцый у архітэктуры і дэкаратыўным мастацтве. Перыядызацыя мастацкай культуры. Сасуды з сетчатым арнаментам. Скальныя малюнкі чырвонай фарбай. Гравіраваны арнамент манументальных надмагільных каменных стэл (“аленых камянёў”). “Звярыны стыль” у вышыўцы і войлачных дыванах з аплікацыяй. Вырабы з бронзы, срэбра і золата. З’яўленне партрэту ў скульптуры ў VI – VIII стст. Партрэтныя вобразы палкаводцаў.

## Тэма 4. Мастацтва Старажытнай Амерыкі і Афрыкі

***Мастацтва Дакалумбавай Амерыкі.*** Асаблівасці культуры. Плямённыя ўтварэнні Старажытнай Амерыкі. Тры буйныя племені: майя, ацтэкі, інкі.

Дамы-паселішчы старажытных плямёнаў з прыступкавымі ярусамі вакол унутранага двара. Храмы ранняга перыяду ў выглядзе ступенчатай піраміды. Скульптурны дэкор. Крэпасное будаўніцтва інкаў.

Насценны жывапіс. Фрэскавыя роспісы ў Тэпанцітлане. Роспісы храма ў Бонампаке, храма Ягуараў у Чычэн-Іцэ. Фрыз у Мітле. Мастацтва мініяцюры.

Керамічныя вырабы інкаў: вазы-партрэты, сасуды з выявамі багоў, воінаў, музыкантаў. Паліхромныя пахавальныя сасуды майя. Цыліндрычныя, яйкападобныя і сасуды з гарлавінай у выглядзе чалавечай галавы ў мастацтве альмекаў. Ювелірнае майстэрства і вырабы з металаў. Багацце і разнастайнасць расфарбоўкі тканіны (да 190 таноў). Вырабы з пер’яў.

***Афрыканскае мастацтва.*** Агульныя асаблівасці мастацтва Суданскай, Гвінейскай і Кангалезскай зон.

Формы скульптурных, пластычных абрысаў у дойлідстве. Круглыя і цыліндрычныя матывы ў жыллёвай архітэктуры Гвінейскай і Кангалезскай зон. Будаўніцтва мячэцяў у Суданскай зоне.

Асаблівасці афрыканскай скульптуры. Афрыканскія скульптурныя ідалы.

Кераміка. Апрацоўка метала і ювелірныя вырабы. Вырабы з розных парод дрэва: мэбля, дэталі архітэктурных упрыгожванняў, посуд, музычныя інструменты, прадметы ўжытку, маскі. Ткацтва: асноўныя тэхнічныя прыёмы. Тканіна з рафіі з геаметрычным малюнкам у Кангалезскай зоне. Клетчатая тканіна нябесна-блакітнага колеру з чырвонымі чарапахамі і завіткамі ў Гвінейскай зоне. Вырабы са слановай касці.

## Тэма 5. Антычнае мастацтва

***Крыта-мікенская культура.*** Асаблівасці мастацтва. Кносскі палац і палац у Цірынфе: асаблівасці архітэктурна-прасторавай кампазіцыі. “Львіныя вароты” у Мікенах, упрыгожаныя рэльефамі з выявамі двух львіц. Купальныя царскія грабніцы (талосы). Грабніца Агамемнона.

Фрэскавы роспіс. Фрэскі Кносскага і Цірынфскага палацаў. Роспіс саркафага з Агіа-Трыяды. Асаблівасці кампазіцыі ў жывапісу. Рэльефны арнамент “Скарбніцы Атрэя” у Мікенах.

Дробная пластыка з камяню, гліны. Дынамічнасць малюнка керамічных вырабаў. Фаянсавыя таблічкі з анімалістычным матывам. Ювелірнае майстэрства. Бронзавыя вырабы: статуэткі і зброя.

***Старажытная Грэцыя.*** Асаблівасці мастацтва. Перыядызацыя: Гамераўскі, Архаічны, Класічны, Эліністычны перыяды. Успрыняцце дасягненняў усходняй культуры. Наватарства мастацкіх форм.

Сістэма ордэраў у архітэктуры, іх канструктыўныя асаблівасці. Тры тыпы ордэраў: дарычны, іанічны, карынфскі. Будаўніцтва храмаў. Храмы Апалона ў Карынфе, Пасейдона ў Пестуме; свяцілішча Артэміды ў Эфесе; храмы Геры на в.Самос, Апалона ў Дзідзімах. Архітэктура Класічнага перыяду: узнікненне тыпу храма – перыпцер. Ансамбль Афінскага Акропалю. Спалучэнне дарычнага і іанічнага стылю ў архітэктуры Парфенона (арх. Ікцін і Калікрат) і Прапілеяў. Асаблівасці архітэктурна-прасторавай кампазіцыі храма Нікі Аптэрос, Эрэхтэёна. Буйныя пабудовы Класічнага перыяду: Маўзалей у Галікарнасе. Манументальны алтар Зеўса ў Пергаме. Фароскі маяк у Александрыі. Свецкае дойлідства: каменныя тэатры ў Дэльфах, Прыене, Пергаме; бібліятэкі ў Александрыі, Пергаме.

Статычнасць у скульптуры перыяду Архаікі (“Артэміда Дэлоская”, “Апалон Тэнейскі”). Скульптура грэчаскай Класікі. З’яўленне руху ў скульптуры Мірана (“Дыскабол”, “Афіна і Марсій”). Распрацоўка прапорцый чалавечага цела ў скульптуры Паліклета (“Дарыфор”). Удзел Фідзія ў стварэнні Афінскага Акропалю, рэльефы Парфенона, статуя “Афіна Лемнія”, “Зеўс”. Скульптура Позняй Класікі: Скопас “Галава параненага воіна” (франтон храма Афіны ў Тэгее); Праксіцель “Гермес з Дзіонісам”, “Афрадзіта Кніцкая”; Лісіп “Апаксіамен”. Распрацоўка новага канону прапорцый чалавечага цела (“Геракл з ільвом”, “Адпачываючы Геракл”). Леахар “Апалон Бельведэрскі”. Скульптура

Эліністычнага перыяду. “Ніка Самафракійская”. Рэльефы Пергамскага алтара Зеўса (“Бітва багоў з гігантамі”). Агесандр “Афрадзіта Мілоская”. Агесандр, Палідор, Афінадор “Лаокоон”.

Керамічныя вырабы: іх прызначэнне. Грэчэскі вазапіс. Асноўныя формы і прынцыпы роспісу (чорнафігурны, чырвонафігурны вазапіс). Экзекій “Кілік з Дзіонісам”. Андакід “Амфара з Гераклам”. Імітацыя керамічных вырабаў у шкле. Апрацоўка металаў. Драўляная мэбля і посуд. Росквіт ювелірнага майстэрства ў перыяд Элінізму. Развіццё ткацтва (лён, шэрсць, шоўк). Апрацоўка скуры.

***Старжытны Рым.*** Асаблівасці грамадска-палітычнага і культурнага жыцця, развіццё навукі. Уплыў старажытнагрэчаскай культуры на рымскую.

Горадабудаўніцтва ў ранні Рымскі перыяд: рэгулярная планіроўка гарадоў, машчоныя вуліцы, сістэма каналізацыі. Этруская архітэктура і яе ўплыў на рымскую. Асаблівасці прасторавай кампазіцыі старажытна-рымскага жылля і яго аздабленне (мазаіка, роспісы, скульптурныя ўпрыгожванні). Манументальныя роспісы ў Пампеі. Вынаходніцтва бетону. Храмы-ратонды (храм Весты). Арачна-сводчатая канструкцыя, аркады, купалы, крыжовы, цыліндрычны і корабавы своды як архітэктурнае наватарства рымлян. Грамадскія будынкі і іх адметныя рысы. Амфітэатр Калізей: прызначэнне, архітэктурна-прасторавая кампазіцыя, аздабленне. Тэрмы Каракаллы. Базілікальныя пабудовы (базіліка Максенцыя). Культавая архітэктура перыяду Рымскай Імперыя. Пантэон. Узвядзенне трыумфальных арак і трыумфальных калон. Арка Ціта. Траянская калона.

Адметныя асаблівасці рымскага скульптурнага партрэту. Партрэт старога рымляна, Вітэлія, Каракаллы. Манументальная скульптура Старажытнага Рыму. Конны манумент Марка Аўрэлія.

Дэкаратыўны жывапіс. Уплыў грэчаскага і этрускага мастацтва. Імітацыя каменнай, мармуравай абліцоўкі і інкрустацыі сцен у манументальных роспісах. Развіццё керамікі. Тэракотавыя ліхтары і ганчарны посуд. Выдуўное шкло. Тэхніка інкрустацыі кавалкамі шкла рознага колеру (“паліхромны стыль”), гравіроўка па шклу, тэхніка залачонага шкла. Ювелірныя вырабы. Срэбраны бюст Люцыя Вера ў даспехах з Марэнга. Вырабы з металу і дрэва. Ткацтва. Ужыванне кітайскага шоўку. Тэхнікі нашыўкі і набойкі.

## Тэма 6. Мастацтва Сярэднявечча

Агульная характарыстыка перыяду. Грамадска-палітычныя адносіны ў перыяд феадалізму. Рэлігійныя ўяўленні і вераванні. Перыядызацыя мастацкай культуры. Сінтэз мастацтв у часы Сярэднявечча. Конон у мастацтве Сярэдніх стагоддзяў.

***Мастацтва Візантыі.*** Асаблівасці мастацкай культуры Візантыі. Хрысціянства як дзяржаўная рэлігія і яго ўплыў на развіццё мастацтва.

Культавая архітэктура. Два тыпы хрысціянскіх храмаў: базіліка, крыжова-купальны. Базіліка святога Аппалінарыя ў Равэне. Сафійскі сабор у Канстанцінопалі (арх. Анфімій, Іссідор). Асаблівасці архітэктурна-прасторавай кампазіцыі, адздабленне.

Развіццё манументальнага жывапісу. Мазаічныя ансамблі храма святога Віталія, святога Аппалінарыя ў Равэне, царквы Сант Амбоджо ў Мілане, сабора святога Марка ў Венецыі. Фрэскавы жывапіс. Іконапіс і мініяцюра.

Кераміка. Кафля з выявай Божай маці з Іісусам, выявы святых. Палiваны посуд. Ужыванне тэхнікі сграффіта. Шкляныя вітражы. Рэліктавыя ювелірныя вырабы. Апрацоўка метала. Бронзавыя вароты храма святой Сафіі. Культавыя драўляныя вырабы (кафедра ў Равэне: трон архіепіскапа Максіміліана). Матывы Дабравешчання ў ткацтве.

***Ірланскае і дараманскае мастацтва.*** Ірланскі жывапіс. Кніжная мініяцюра. Апрацоўка камяню. Каменныя крыжы з гравіраваным і каменным арнаментам.

Агульная характарыстыка мастацтва остготаў, вестготаў, каралінгаў, аттонаў.Перавага дэкаратыўнага пачатку. Кераміка. Апрацоўка металаў, ювелірныя вырабы. Асаблівасці архітэктуры. Узнікненне абарончай вежы тыпу Данжон у перыяд каралінгаў. Будаўніцтва ўмацаваных вайсковых лагераў – бураў. Свецкае дойлідства: узвядзенне палацаў і бібліятэк. Фрэскавы жывапіс і кніжная мініяцюра.

***Старажытнарускае мастацтва.*** Сувязь мастацтва Кіеўскай Русі з візантыйскім. Культавае будаўніцтва. Візантыйскі тып крыжова-купальнага храма. Кіеўскі Сафійскі сабор. Шматкупальнасць як мясцовая традыцыя старажытнарускага дойлідства. Фрэскавы жывапіс Сафійскага сабора ў Кіеве. Залатыя вароты. Наўгародская школа дойлідства. Сафійскі сабор у Ноўгарадзе.

Мастацтва канца XII – сярэдзіны XIV стст. (перыяд феадальнай раздробленасці). Аднакупальны храм XII ст. Растова-Суздальская школа дойлідства. Дзмітрыеўскі сабор ва Уладзіміры, царква Пакрова на Нерлі. Фрэскавы жывапіс і іконапіс: уплыў візантыйскай традыцыі. Архітэктура Маскоўскага княства. Успенскі сабор (арх. Арыстоцель Фіараванці). Росквіт жывапісу. Творчасць Феафана Грэка. Андрэй Рублёў "Троіца".

Мастацтва другой паловы XV – пачатку XVI стст. Утварэнне Рускай цэнтралізаванай дзяржавы. Перабудова Маскоўскага Крамля. Культавае дойлідства. Храм Узнясення ў Каломенскім. Сабор Васіля Блажэнага. Гранатавая палата. Творчасць Дзіянісія ("Распяцце").

Мастацтва XVII – пачатку XVIII стст. Стыль Узорач'я. Узмоцненая дэкаратыўнасць, кафлянае аздабленне. Царква Троіцы ў Кітаі-горадзе ў Маскве. Нацыянальныя асаблівасці рускага барока. Нарышкінскае і Галіцынскае барокка. Царква Знамення ў Дуброўі. Іконапіс XVII ст. Светлацень і аб'ёмнае выяўленне фігур у творчасці Сымона Ушакова.

***Раманскае мастацтва.*** Раманскі стыль у Заходняй Еўропе: агульная характарыстыка. Кампазіцыйныя прыёмы і стылістычныя рысы раманскага дойлідства. Росквіт архітэктуры ў Францыі: бургунская і нарманская школы. Асноўныя тыпы пабудоў: феадальны замак, манастырскі ансамбль і храм. Рымская базіліка як аснова раманскага храма. Сводчатыя канструкцыі паўцыркульных абрысаў, гладкія тоўстыя сцены з невялікай колькасцю вузкіх праёмаў. Царква Нотр-Дам ля Гранд у Пуацье (Францыя), Храмы ў Вормсе, Шпейеры і Майнцы (Германія), Венецыянскі сабор святога Марка,

архітэктурны ансамбль у Пізе (Італія), Царква Сант Яга дэ Кампастэлла (Іспанія), Лонданскі Тауэр з Белай вежай (Англія).

Скульптурнае аздабленне раманскіх храмаў. Дэкаратыўная скульптура парталаў (цімпаны), капітэляў калон і архівольтаў сводаў. Партал храма ў Везле ("Страшны суд"). Партал царквы Сэн-Пьер у Муассаке ("Апостал Пётр").

Мазаіка і фрэскавы жывапіс. Выявы задыякальных знакаў у мазаікі падлогі царквы Сан-Міньята-аль-Монтэ каля Фларэнцыі. Раманскі насценны жывапіс. Дзве буйныя школы: "школа светлых фонаў" і "школа сініх фонаў". Кніжная мініяцюра Францыі і Іспаніі.

Разнастайнасць керамічных вырабаў. Шкляныя вітражы з перавагай сіняга і чырвонага колеру. Сасуды з выдуўнога шкла. Ювелірнае майстэрства. Апрацоўка металаў і дрэва. Культавыя вырабы са слановай касці. Ткацтва ("Дыван з Байё", вышыўка з Героны на сюжэт з Кнігі Быцця, шаўковая туфля папы Клімента ІІ, Мітра святога Отта). Вытворчасць шпалер.

***Готыка.*** Пачатак фарміравання нацыянальных дзяржаў. Этымалогія тэрміна "готыка". Узнікненне і распаўсюджанне стылю.

Асаблівасці гатычнай архітэктуры. Будаўніцтва гарадскіх кафедральных сабораў. Росквіт французскага гатычнага дойлідства. Рымская базіліка як аснова гатычнага сабора. Каркасная сістэма сводаў, контрфорсы і аркбутаны, павелічэнне аконных праёмаў. Дэкаратыўнае аздабленне. Царква абацтва Сэн-Дэні, сабор Парыжскай Божай маці, саборы ў Рэймсе, Амьене, Руане (Францыя); Кёльнскі сабор (Германія); Кентэрберыйскі сабор, саборы ў Лінкальне, Уэлсе, Солсберы (Англія); саборы ў Леоне, Бургасе, Таледа (Іспанія); саборы Санта-Крочэ, Санта-Марыя Навэлла, Санта Марыя дэль Фьёрэ, Міланскі сабор (Італія); Карлаў мост у Чэхіі. Свецкае дойлідства: будаўніцтва палацаў. Палаццо Веккіо ў Фларэнцыі, палац Дожаў у Венецыі.

Сінтэз скульптуры і архітэктуры. Аздабленне манументальнай скульптурай храмавых комплексаў. Скульптура сабору Парыжскай Божай маці, сабораў у Рэймсе, Амьене.

Тэмперная і фрэскавая тэхнікі ў манументальным жывапісу. Роспісы цэркваў, палацаў, замкаў, жылля. Мастацтва кніжнай мініяцюры: тэндэнцыя імкнення да рэалізму. Творчасць мініяцюрыстаў Жана Фуке, Жана Бурдзішона.

Керамічныя вырабы. Вытворчасць ганчарнага посуду. Шкляныя вітражы. Мастацкія цэнтры ювелірных вырабаў пры манастырах і дварах. Тэхніка эмалі. Апрацоўка металаў (бронзавыя і латунныя вырабы). Драўляная мэбля. Ткацтва: разнастайнасць матэрыялаў і тэхнік. Вытворчасць шпалер.

## Тэма 7. Мастацтва Сярэдневяковага Усходу

***Мастацтва Індыі.*** Агульная характарыстыка перыяду. Перыядызацыя мастацтва. Культавая архітэктура. Асноўныя тыпы храмаў: Вімана, Шыкхара. Абарончае дойлідства. Грамадская архітэктура. Уплыў ірана-сярэднеазіяцкай архітэктуры. Будаўніцтва мячэцей, медрэсэ, маўзалеяў. Маўзалей Тадж-Махал у Агрэ: асаблівасці архітэктурна-прасторавай кампазіцыі, рэгулярны кіпарысавы сад з вадаёмамі, аздабленне інтэр'ера мазаікай. Традыцыйныя індыйскія

храмавыя комплексы на востраве Ява. Уплыў Кітая на індыйскае дойлідства XII – XVIII стст.

Фрэскавы жывапіс. З’яўленне кніжнай мініяцюры ў XI ст. Керамічныя вырабы эпохі Губтаў. Фаянсавыя вырабы ў мусульманскім стылі часоў дынастыі Маголаў. Ювелірнае майстэрства. Металічныя статуі і статуэткі Будды і іншых баствоў. Апрацоўка дрэва: інда-партугальскі і інда-галанскі стылі. Развіццё вышыўкі з XI ст. Уплыў іранскіх традыцый на ткацтва XVII – XVIII стст.

***Мастацтва Кітая.*** Агульная характарыстыка перыяду. Храналогія мастацтва. Сцвярджэнне феадальных адносін у IV – VI стст. Усталяванне будызму як новай светапогляднай ідэалогіі. Фарміраванне пад уплывам будызму новых вобразаў і стылістычных заканамернасцяў мастацтва. Пагады, раннія будыйскія скальныя храмы Кітая і іх аздабленне. Статуі Будды як неад’емная частка пячорных комплексаў. Насценныя роспісы. Апавядальны жанр жывапісу. Гарызантальныя і вертыкальныя світкі. Творчасць Цзун Біну, Гу Кай-чжы, Ван Вэя. Узнікненне фарфору.

Мастацтва часоў дынастый Тан і Сун (VII – XIII стст.). Асаблівасці эканамічнага развіцця краіны. Будаўніцтва Вялікага каналу. Вялікі шаўковы шлях. Вынаходніцтвы сусветнага значэння – порах, магнітны компас, разборны шрыфт. Кнігадрукаванне: ксілаграфічны спосаб. Асаблівасці архітэктуры і горадабудаўніцтва Танскага і Сунскага перыядаў. Ландшафтныя сады. Скульптура як неад’емны кампанент будыйскага мастацтва. Алтарныя шматфігурныя кампазіцыі. Скульптурнае аздабленне пахавальных склепаў. Статуя Будды Лаканы (пячора Луньмэня). Манументальны жывапіс. Пячорныя роспісы. Жывапіс на світках. Жанры кітайскага пейзажу: “людзі і прадметы” (Янь Лі-бэнь, Чжан Сюань, Чжоў Фана), анімалістычны жанр (Хань Гань), “кветкі і птушкі” (Бянь Луань, Дзяо Гуань-інь). Пейзажы Ван Вэя і Дун Юань. Росквіт кітайскага пейзажнага жывапісу ў другой палове X ст. (Лі Чэн, Сюй Дао-нін, Го Сі). Вобраз чалавека ў творчасці мастакоў XII – XIII стст. (Ма Юань, Ся Гуй). Развіццё керамікі: вырабы з белага фарфору. Каляровае шкло. Мастацтва шоўка.

Мастацтва канца XIII – XIV стст. (дынастыя Юань). Горадабудаўніцтва і архітэктура. Сталіца – Даду (Пекін). Пейзаж як вядучы від кітайскага жывапісу. Мастацтва каліграфіі. Світкі на паперы ў творчасці Ні Цзаня. Прыдворны жывапіс Жэнь-Жэнь-фа, Ван Чжэн-пэна, Ван Юаня, Чжао Мэн-фу. Выкарыстынне сіняга кобальту ў кераміцы. Ювелірныя вырабы, ткацтва.

Перыяд позняга феадалізму ў Кітаі (канец XIV – XIX стст.). Праўленне дынастый Мін і Цын. Горадабудаўніцтва. Будаўніцтва палацаў, храмаў, сядзіб і садова-паркавых комплексаў. Зала Вышэйшай гармоніі. Храм Неба. Ансамбль трынаццаці царскіх пахаванняў Мін. Бытавы жанр у жывапісу (Тан Інь, Чоў Ін). Пейзажны жанр. Партрэт. Кераміка. Стварэнне Імператарскай мануфактуры. Бела-сіні фарфор XV ст. Літое шкло. Ювелірнае майстэрства. Апрацоўка металаў.

***Мастацтва Японіі.*** Змены ў палітычным і культурным жыцці. Перыяд панавання другога саслоўя – ваеннага дваранства (XIII – XV стст). Бусіда –

самурайскі кодэкс чэсці. Вучэнне секты Дзэн. Аднаўленне будыйскіх манастыроў і храмаў. Будаўніцтва дзэнскіх храмавых комплексаў. Асаблівасці выяўленчага мастацтва. Скульптурны партрэт у творчасці мастакоў Кокэя, Ункэя, Кайкэя. Перавага індывідуальнага пачатку. Жывапіс на світках. Японскі манахромны жывапіс у творчасці Сэссю. Садовае мастацтва двух тыпаў: пейзажны сад з халмамі (цукіяма), плоскі сад (хіраніва).

Свецкая культура XVI – пачатку XVII стст. Свецкі жывапіс. Прыдворная школа Кано. Дэкаратыўныя кампазіцыі на шырмах. Манументальны жывапіс. Чайная цэрымонія і яе эстэтычныя каноны.

Мастацтва другой паловы XVII – XIX стст. Позняе Сярэднявечча ў Японіі. Гарадская культура. Горадабудаўніцтва. Узмацненне ролі дэкаратыўных роспісаў у жывапісу. Гравюра на дрэве як асноўны від японскага мастацтва XVIII – XIX ст. Вытворчасць фарфора. Лакавыя вырабы. Ткацтва. Мастацтва дробнай пластыкі – нэцке.

***Мастацтва Карэі.*** Асаблівасці мастацкай культуры і яе перыядызацыя. Мастацтва перыяду аб’яднанага Сілла (VIII – IX ст.). Працэс феадалізацыі і фарміравання карэйскай народнасці. Усталяванне гандлёвых і культурных сувязей з Індыяй, Кітаем, Японіяй, Іранам. Замацаванне пазіцый будызма. Горадабудаўніцтва. Стварэнне буйных сінтэтычных ансамблей. Пячорныя храмы. Храм Саккурам. Тэндэнцыя да выяўлення руху ў скульптурных выявах. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: выдучая роля керамікі.

Перыяд Корё (X – XIV стст.). Будызм як вядучая ідэалогія. Распаўсюджанне ксілаграфічнага спосабу кнігадрукавання ў X ст. Аздабленне пабудоў: вядучая роля малых архітэктурна-пластычных форм у архітэктуры. Крэпасныя збудаванні, палацы, пагады, пахавальныя ансамблі. Страчванне манументальнай архаічнасці на карысць лёгкасці ў керамічных вырабах. Глазураваная кераміка.

Перыяд праўлення дынастыі Лі (XIV – пачатак XIX стст.). Успрыняцце канфуцыянства з Кітая. Будаўніцтва палацавых комплексаў. Заснаванне Прыдворнай акадэміі жывапісу Тохвавон. Жывапіс на світках. Кераміка. Вытворчасць фарфору з XVII ст. Апрацоўка дрэва.

***Манголія.*** Аб’яднанне мангольскіх плямёнаў і ўтварэнне дзяржавы у феадальны перыяд. Пашырэнне гандлёвых сувезей. Рэлігійныя вераванні: шаманізм; успрыняцце хрысціянства, будызма, ісламa. Заснаванне ў 1220 г. сталіцы (Каракорум). Рэгулярная планіроўка гарадоў. Свецкае дойлідства. Палац хана Угедэя ў Каракоруме. Уплыў феадальнай раздробленасці на мастацкую культуру ў перыяд XIV – XVI стст. Адраджэнне манументальнага дойлідства ў канцы XVI ст. Культавае будаўніцтва (манастыр ансамбля Эрдэні-дзу). Юрты – гэр: асаблівасці канструкцыі, аздабленне. Саборныя храмы – цогчын. Узвядзенне манастыроў трох тыпаў у XVII – пачатку XVIII стст.: хурэ, хійд, сум. Змяненне тыпаў храмавых ансамблей ў XIX – XX стст.

Росквіт будыйскай пластыкі ў XVII – пачатку XVIII стст. Дзанбадзар “Зялёная Тара”. Экспрэсіўны характар выканання статуй устрашаючых баствоў. Іконапіс: асаблівасці тэхнікі выканання. Двухколерны жывапіс XVII ст. Іконы-

аплікацыі. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: апрацоўка металаў, ювелірнае майстэрства.

***Азербайджан і Сярэдняя Азія.*** Асаблівасці культуры. Палітычна-эканамічныя сувязі з Іранам. Народнае дойлідства: мясцовыя асаблівасці. Панаванне хрысціянства ў IV – VII стст. Дзербенцкія ўмацаванні. Асаблівасці будаўнічай тэхнікі. Заваёва Азербайджана арабамі ў VII ст. Узвядзенне феадальных замкаў, мячэцяў, маўзалеяў. Палацавы комплекс шырваншахаў у Баку.

Асаблівасці архітэктуры Сярэдняй Азіі. Раннія пасяленні. Будаўніцтва феадальных замкаў вежавага тыпу ў раннім Сярэднявеччы. Далучэнне Сярэдняй Азіі ў VII ст. да Арабскага халіфату. Росквіт культуры ў XI ст. Змены ў архітэктуры XIV ст. Роля дэкаратыўнага аздаблення ў дойлідстве.

***Мастацтва арабаў.*** Агульная характарыстыка культуры і перыядызацыя мастацтва. Перавага дэкаратыўнага пачатку ў мастацтве. Абстрактны дэкор. Веравызнанне – іслам. “Каран” як асноўны рэлігійны твор, яго мастацкая форма.

Рэгіянальныя асаблівасці мусульманскай архітэктуры. Агульныя рысы ў стылі афіцыйных будынкаў (мячэцей, палацаў, маўзалеяў, медрэсэ). Жыллёвая архітэктура Алжыра, Туніса, Марока, Егіпту. Традыцыйны мусульманскі архітэктурны ансамбль.

Дэкаратыўны фрэскавы жывапіс і мініяцюра. Багдадская школа мініяцюры. Мініяцюра Ірана. Вытворчасць керамікі. Цэнтры ганчарнага посуду: Самара; Ракка (Сірыя); Рэй, Кушан, Гурган (Іран). Фаянс і фарфор. Выдуўное шкло Егіпту і Сірыі з сетчатым дэкорам. Турэцкае каляровае шкло. Ткацтва. Сімволіка дываноў.

***Мастацтва Каўказа.*** Фарміраванне армянскай і грузінскай народнасцей. Палітычнае, грамадскае і культурнае жыццё. Хрысціянства як афіцыйная рэлігія. Храмавая архітэктура: трохнэфныя і аднанэфныя базілікі. Уплыў візантыйскага купальнага дойлідства. Ансамбль збудаванняў Санаінскага манастыра ў Арменіі (X – XIII стст.). Каменны дэкор на фасадах і адсутнасць аздаблення ў інтэр’еры. Распаўсюджанне іранскага тыпу жылля ў архітэктуры.

## Тэма 8. Эпоха Адраджэння

Змены ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці. Філасофска-эстэтычныя погляды. Дэмакратызацыя культуры. Развіццё навукі. Сцвярджэнне ідэала гарманічнай асобы. Свецкі і гуманістычны характар культуры. Праблема перыядызацыі мастацтва. Зварот да антычнай спадчыны. Працэс аддзялення мастацкіх каштоўнасцей ад рэлігійна-этычных. Узнікненне тэорыі выяўленчага мастацтва як спецыяльнай галіны ведаў.

***Адраджэнне ў Італіі.*** Асаблівасці развіцця культуры ў Італіі. Ранняе развіццё гарадоў. Буйныя цэнтры гандлю і вытворчасці (Фларэнцыя, Піза, Сіена, Генуя, Мілан, Венецыя).

Архітэктура Італіі. Выкарыстанне антычных традыцый і канструкцыйных прыёмаў готыкі ў культавым будаўніцтве. Творчасць Філіппа Брунеллескі (купал сабора Санта Марыя дэль Фьёрэ, царква Сан Ларэнца, Выхаваўчы дом ў

Фларэнцыі). Грамадская архітэктура. Творчасць Палладзіо (Палаццо Порта, Палаццо Кьерыкаці, Вілла Ратонда). Разуменне сінтэза мастацтваў. Сабор Святога Пятра ў Рыме.

Італьянская скульптура. Рэльефы кафедры баптыстэрыі ў Пізе (Н.Пізана). Скульптурны патрэт Рэнесансу. Творчасць Данатэла (“Святы Георгій”, “Давід”). Гіберці (рэльефы дзвярэй Фларэнтыйскай баптастэрыі). Вероккіо “Давід”, конны манумент кандацьера Бартала Калеоні. Мікеланджэла “Пьета”, “Давід”, “Маісей”.

Манументальны і станкавы жывапіс. Джотта (фрэскі капэлы дэль Арэна ў Падуі). Фрэскі Мазаччо. Творчасць Сандра Бацічэллі. “Нараджэнне Венеры”, “Вясна”. Тры цітана Высокага Адраджэння: Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Рафаэль. Дасягненні ў выяўленчым мастацтве Леанарда да Вінчы. Этапы творчасці: Міланскі і Фларэнтыйскі перыяды. Роспіс “Тайная вячэра” у трапезнай манастыра Санта-Марыя дэле Грацыо ў Мілане. Партрэтная творчасць. “Джаконда”. Эвалюцыя вобраза мадонны ў мастацтве Рафаэля. “Сіксцінская мадонна”. Роспіс Ваціканскіх станц: “Станцы дэлла Сеньятура”, “Дыспут”, “Афінская школа”, “Правасуддзе”. Жывапісныя творы Мікеланджэла. Роспіс плафона Сіксцінскай капэлы. Фрэска Сіксцінскай капэлы “Страшны суд”. Венецыянская школа жывапісу. Джарджоне. Тыцыян. Веранэзе. Цінтарэтта.

Росквіт дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Керамічная скульптура Андрэа дэлла Роббіа. Фаянсавы посуд. Венецыянскае шкло і эмалі. Вітражы. Значэнне скульптурнага дэкору ў мэблі. Вырабы са слановай касці і скуры. Ткацтва: шшаўковая, бархатная тканіна. Італьянская вышыўка. Дываны па картонах Рафаэля.

***Паўночнае Адраджэнне.*** Народны рух і палітычная барацьба. Нацыянальныя традыцыі ў культуры Нідэрландаў, Германіі, Францыі. Вядучая роля выяўленчага мастацтва.

Мастацтва Нідэрландаў. Генцкі алтар братоў Губерта і Яна ван Эйкаў. Творчасць Яна ван Эйка. “Мадона канцлера Ролена”. Партрэт супругаў Арнальфіні. Адлюстраванне народных тэндэнцый у жывапісу. Перавага індывідуальнага над тыповым. Драматызм у мастацтве Рагіра ван дэр Вэйдэна, рэлігійная тэматыка тврчасці. Сувязь з фальклорам у творах Іеранімуса Босха. “Карабель дуракоў”. “Сад суцяшэння”. Пашырэнне тэматыкі жывапісу, маральныя і эстэтычныя праблемы ў творчасці Пітэра Брэйгеля Старэйшага. “Сялянскі танец”, “Сялянскае вяселле”, “Танец пад шыбеніцай”, цыкл карцін “Месяцы”.

Мастацтва Германіі. Рэфармацыйны рух і яго ўплыў на нямецкае мастацтва. Вядучае месца алтарнага вобразу ў XV ст. Росквіт гравюры. Праблемы суадносінаў прадметаў у прасторы, размяшчэння фігуры чалавека ў пейзажы ў творчасці А.Дзюрэра. Жывапіс А.Дзюрэра. “Аўтапартрэт”, “Чатыры апосталы”. Гравюры “Рыцар, смерць і дзьявал”, “Меланхолія”, “Святы Іеранім”. Творчасць М.Грюневальда (“Бічаванне Хрыста”, “Ізенгеймскі алтар”). Дынамізм кампазіцыйнай пабудовы, кантраст колераў, лірызм у працах Лукаса

Кранаха Старэйшага (“Распяцце”, “Венера і амур”, “Адпачынак па дарозе ў Егіпет”). Творчасць А.Альтдорфера і Ганса Гальбейна Малодшага.

Рэнесанс у Францыі. Дваранская буржуазная культура. Прыдворны жывапіс Жана Фуке. Партрэты Франсуа Клуэ (партрэт Францыска I). Скульптура французскага Рэнесансу. Жан Гужон “Фантан німф”. Круглая пластыка і мемарыяльная скульптура Жэрмэна Пілона. Асаблівасці архітэктуры. Палацавае дойлідства. Пьер Леско. Лувр.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва краін Паўночнага Адраджэння. Руанскі фаянс. Немецкая кераміка. Французскія вітражы. Ювелірныя вырабы. Апрацоўка металаў: бронза, жалеза, олава. Мэбля. Французская вышыўка. Вытворчасць шпалер (Францыя).

***Адраджэнне ў Іспаніі.*** Роля рэлігіі ў развіцці мастацтва. Індывідуалізацыя вобразаў у творчасці Хаімэ Уге. Рэтабло святых Абдона і Серэна. Уплыў нідэрландскага жывапісу ў мастацтве Пэдра Беругетэ. Прыдворны жывапіс А.С.Коэльё і Х.П. дэ ла Круса. Аблюстраванне аскетычнага сярэдневяковага ідэалу ў карцінах Луіса дэ Маралеса (“Мадонна з немаўляткам”, “Смутак Божай маці”). Творчасць Эль Грэка. “Пахаванне графа Оргаса”, “Апосталы Пётр і Павел”. Партрэты Эль Грэка.

Іспанская скульптура. Экспрэсія і дэкаратывізм у работах Алонса Беругетэ (надмагілле кардынала Тавара ў царкве Сан Хуан дэ Афуэра ў Мадрыдзе, дэкарыроўка сядзенняў у хоры сабора ў Таледа). Архітэктура Іспаніі. Хуан дэ Эррэра. Палац Эскарыял.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Іспанская фаянсавая кафля. Росквіт ювелірнага майстэрства. Эмалевы посуд. Ткацтва.

***Адраджэнне ў Англіі.*** Асаблівасць гістарычнай сітуацыі. Уплыў Нідэрландаў на фарміраванне англійскай архітэктуры. Сіметрыя планаў, дакладнае чляненне будынкаў на паверхі, выкарыстанне ордэраў у грамадскіх збудаваннях (Уоллатан Хол, Монтакют Хауз). Загарадны дом як тып грамадскай пабудовы. Роберт Лаймінг. Хэтфілд-хаус. Творчасць архітэктара Інга Джонса. Палац Уайтхол у Лондане. Дом каралевы ў Грынвічы.

Партрэт як вядучы жанр англійскага жывапісу. Партрэты немецкага мастака Ганса Гальбейна Малодшага (партрэт Георга Гісцэ, партрэт Генрыха XVIII). Жанр партрэтнай мініяцюры. Творы Н.Хілліарда і І.Олівера.

## Тэма 9. Мастацтва Заходняй Еўропы XVII ст.

Асаблівасці гістарычнага развіцця краін Заходняй Еўропы ў XVII ст. Палітыка-эканамічныя і культурныя працэсы. Фарміраванне нацыянальных дзяржаў. Развіццё навукі. Разнастайнасць стыляў і накірункаў у мастацкай культуры. Барокка. Класіцызм.

***Мастацтва Італіі.*** Зараджэнне стылю барокка ў італьянскім мастацтве. Асаблівасці стылю. Горадабудаўніцтва: трохпрамянёвая сістэма планіроўкі. Пануючае месца архітэктуры сярод іншых відаў мастацтва. Дынаміка кампазіцыі, кантрасты маштабаў і рытмаў, крывалінейнасць абрысаў як характэрныя рысы культавага дойлідства. Дж. дэлла Порта: царква Іль Джэзу. Царкоўная архітэктура Ф.Барраміні (цэрквы Сан Карла алле Куатра Фантанэ,

Сант Іво). Творчасць Л.Берніні. Плошча сабора святога Пятра ў Рыме. “Скала Рэджа” (Каралеўская лесвіца ў Ватыкане): выкарыстанне новых прыёмаў пры стварэнні перспектывы. Архітэктура позняга барокка. Гварына Гварыні: складанасць прасторавага вырашэнны, фантастычнае багацце дэкора. Царква Сан Ларэнца, палаццо Карыньяні ў Турыне.

Скульптура барокка. Л.Берніні: “Экстаз святой Тэрэзы”, “Давід”, “Партрэт Людовіка XIV”, “Кардынал Баргезэ”. Заснаванне Блонскай мастацкай акадэміі братамі Караччы. Фрэскавы жывапіс. Роспісы Версаля (браты Караччы). Рэалістычны накірунак у італьянскім жывапісу. Мікеланджэла дэ Караваджыа. Дынамізм у пабудове і драматычная сюжэтыка. Алтарныя карціны (“Палажэнне ў труну”, “Смерць Марыі”). Бытавы жанр і нацюрморт. “Юнак з лютняй”, “Кашолка з садавінай”. Накірунак Караваджызм.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Венецыянскае шкло: тэхнічныя асаблівасці дэкарыроўкі. Бронзавыя вырабы Л.Берніні (ківорый з вітымі калонамі ў саборы святога Пятра, “Кафедра святога Пятра”). Разьба па дрэве. Ткацтва.

***Мастацтва Фландрыі.*** Нідэрландская рэвалюцыя ў канцы XVI ст. Распаўсюджанне стылю барокка. Культавая архітэктура: арыентацыя на традыцыі італьянскага дойлідства. Царква святога Карла Баррамея ў Антверпене (арх. П.Хёйсенс). Царква святога Міхаіла ў Левэне (арх. В.Хесіус).

Значэнне творчасці П.П.Рубенса ў фарміраванні нацыянальнай школы жывапісу. “Вірсавія”, “Персей і Андрамеда”. Гістарычны цыкл. Партрэты і пейзажы П.П.Рубенса. Развіццё партрэтнага мастацтва. Мастацтва Ван Дэйка (“Аўтапартрэт”, “Карл V”). Творчасць Я.Йорданса. Бытавы жанр жывапісу. Жанр нацюрморт у мастацтве Фландрыі. Ф.Снейдэрс.

***Мастацтва Галандыі.*** Асаблівасці дзяржаўнай сітуацыі. Уплыў Нідэрландскай рэвалюцыі на культуру Галандыі першай паловы XVII ст. Пратэстантызм і яго ўздзеянне на мастацтва. Адсутнасць аздаблення ў культувых пабудовах, прастата плану і кампазіцыі. Грамадская архітэктура: ратушы, гандлёвыя рады, рынкі, біржы, шпіталі і г.д. Бюргерскі жылы дом. Будаўніцтва водных камунікацый: каналы, плаціны, дамбы, шлюзы. Сцвярджэнне форм Класіцызму ў архітэктуры сярэдзіны XVII ст. Амстэрдамская ратуша (арх. Якаб ван Кампен).

Разнастайнасць жанраў станкавага жывапісу. Жанр партрэту ў творчасці Ф.Хальса (“Цыганка”, “Рыбак”). Групавы партрэт (“Афіцэры стралковай роты святога Георгія”). Мастацтва Рэмбрандта ван Рэйна: псіхалагізм і гуманістычная накіраванасць творчасці. Этапы творчасці. “Анатамічны эцюд доктара Цюльпа”, “Даная”, “Аўтапартрэт з Саскіяй”, “Начны дазор”, “Святое сямейства”, “Вяртанне блуднага сына”. Партрэты Рэмбрандта. “Партрэт старушкі”, “Чытаючы Цітус”, “Хендрыкье ля вакна”, “Партрэт старыка ў чырвоным”, “Аўтапартрэт”. Афорты і малюнкі Рэмбрандта. Бытавы жанр галандскага жывапісу. “Малыя галандцы” (П. дэ Хоох, Церборх, Метсю, А. ван Остадзе, Я. Вермер Дэльфтскі). Пейзажны жывапіс Я. ван Рэйсдала. Галандскі нацюрморт у творчасці В.Хеда, П.Класа, В.Кальфа.

Фаянсавыя вырабы Нідэрландаў. Апрацоўка металаў. Галандскія люстры з латуні. Мэбля.

***Мастацтва Іспаніі.*** Агульная характарыстыка культуры XVII ст. Архітэктура: арыентацыя на барочныя формы Італіі. Архітэктура ранняга барокка: сабор Эль Рэаль у Мадрыдзе, царква Іаана Хрысціцеля ў Таледа (арх. Ф.Бауціста). Росквіт барочнага дойлідства ў канцы XVII ст. Сабор у Гранадзе (арх. А.Кано).

Рэалістычная накіраванасць іспанскага жывапісу першай паловы XVII ст. Творчасць Х.Рыберы. “Пакута святога Варфаламея”, “Святая Інэсса”. Творчасць Д.Веласкеса. “Меніны”, “Прахі”, “Здача Брэды”. Партрэты Д.Веласкеса: псіхалагічная характарыстыка вобразаў. “Інфанта Маргарыта”, “Папа Інакенцій X”.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Вырабы з металаў. Металічныя агароджы алтароў з арабскім арнаментам. Апрацоўка дрэва: мэбля.

***Мастацтва Францыі.*** Палітыка-эканаічнае развіццё краіны. Фарміраванне стылю Класіцызм. Росквіт архітэктуры. Рысы Класіцызму ў архітэктуры першай паловы XVII ст. Палац Мезон Лаффіт (арх. Ф.Мансар). Класіцызм другой паловы XVII ст. Росквіт палацавага будаўніцтва. Палац Во ле Віконт (Луі Лево, Ленотр, Лебрэн). Версальскі архітэктурны ансамбль. Творчасць А.Мансара. Вялікі Трыанон. “Люстэркавая галерэя”: асаблівасці інтэр’ера. Паркавае мастацтва. Французскі рэгулярны парк.

Жывапіс Класіцызму. Станаўленне нацыянальнай школы жывапісу. Творчасць Н.Пуссэна. “Аплакванне Хрыста”, “Танкрэд і Эрмінія”, “Рынальда і Арміда”. Пейзажны жывапіс Н.Пуссэна. “Пейзаж з Паліфемам”. Лірычныя пейзажы К.Ларрэна. Бытавы жанр у творчасці братоў Ленен. “Сялянскае сямейства”, “Трапеза”.

Вядучая роля Францыі ў развіцці дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Керамічныя вырабы. Шкло. Ювелірнае майстэрства. Апрацоўка металаў. Жалезныя вырабы (Версальскія вароты). Ужыванне свінца ў дэкаратыўнай скульптуры Версальскага парку (скульптурная група з Апалонам Ж.Б.Тубі). Мэбля Ш.Буля, Ш.Лебрэна і Жана Берэна. Ткацтва. Росквіт шпалернага мастацтва.

***Мастацтва Германіі і Англіі.*** Асаблівасці культуры. Архітэктура Германіі. Культавае будаўніцтва. Тэацінская царква ў Мюнхене (арх. А.Барэллі), сабор у Пассау (арх. С.Лугано), манастыр у Вюрцбурге (арх. А.Петрыні). Уплыў французскага дойлідства на будаўніцтва княжскіх палацаў. Гарадскі палац у Патсдаме. Палац і парк Гроссер-гартэн у Дрэздзене (арх. І.Г.Штарке). Шырокае ўжыванне керамічных вырабаў. Вытворчасць белага фаянса. Ювелірныя вырабы з перагружаным дэкорам. Апрацоўка металаў. Мэбля.

Класіцызм у Англіі. Архітэктура. Крыстафер Рэн. Сабор святога Паўла ў Лондане. Уплыў барока ў творчасці архітэктараў Н.Хоксмара, Дж.Ванбру. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Вытворчасць паліванай керамікі. Ювелірная пластыка: уплыў Германіі. Апрацоўка дрэва.

# Тэма 10. Мастацтва эпохі Асветніцтва

Вытокі Асветніцтва. Дзяржаўныя і грамадскія погляды як адмаўленне гуманістычных прынцыпаў. Крызіс дваранскай культуры. Антыфеадальны і рэвалюцыйны светапогляд. Змены ў эстэтычнай свядомасці. Нацыянальна-культурныя асаблівасці Асветніцтва. Уплыў грамадскай і навуковай думкі на духоўную культуру. Роля мастацтва ў сцвярджэнні ідэй Асветніцтва.

***Мастацтва Еўропы.*** Разнастайнасць стыляў і накірункаў у мастацтве. Ракако. Сентыменталізм. Асветніцкі рэалізм. Жывапіс эпохі Асветніцтва. Антуан Ватто – заснавальнік ракако ў жывапісу. “Грамадства ў парку”, “Адплыццё на востраў Кіферу”, “Лаўка Жэрсэна”. Дэкаратыўнасць у жывапісу Франсуа Бушэ. Эскізы для габіленаў, малюнкі для веераў, фантанаў, фарфоравага посуду, статуэтак. “Трыумф Венеры”, “Купанне Дзіаны”, “Мадам дэ Пампадур”. Каларыстычная вытанчанасць у карцінах Жана Анарэ Фраганара. “Пацалунак цішком”, “Шчаслівыя магчымасці арэлей”. Адлюстраванне быту трэцяга саслоўя ў творчасці Ж.-Б.Шардэна. “Прачка”, “Жанчына, якая моіць каструлі”. Нацюрморты Ж.-Б.Шардэна. “Медны бак”, “Атрыбуты мастацтваў”. Сентыменталізм у жывапісу Ж.Б.Грёза. “Бацька сямейства, чытаючы сваім дзецям Біблію”, “Сялянская нявеста”, “Параліцік”, “Пракляцце”.

Асаблівасці італьянскага жывапісу XVIII ст. Пейзажны венецыянскі жывапіс: ведута. Дакладныя ведуты Д.А.Каналетта і Б.Белотта. Фантастычныя ведуты Ф.Гвардзі. Апяванне прыгажосці венецыянскага карнавалу ў творчасці П.Лонгі. Манументальны жывапіс Д.Б.Цьепала: фрэскі і манументальныя пано (цыкл карцін для палаца Дальфіна ў Венецыі, фрэскі палаццо Лабіо ў Венецыі, фрэскі Каралеўскага палаца ў Мадрыдзе).

Асветніцкі рэалізм у англійскім жывапісу. Творчасць У.Хогарта. Сатырычныя серыі карцін “Кар’ера мота”, “Модны шлюб”. “Дзяўчына з крыветкамі”. Псіхалагічная характарыстыка асобы ў партрэтах Дж.Рэйнальдса. “Партрэт каммадора Агастэса Кепела”, “Партрэт адмірала Хітфілда”. Партрэты і пейзажы Т.Гейнсбара. “Блакітны хлопчык”, “Партрэт актрысы Сары Сідданс”, “Партрэт місіс Робертсон”.

Жывапіс асветніцкага Класіцызму. Творчасць Ж.Л.Давіда. “Клятва Гарацыяў”, “Смерць Марата”.

Скульптура XVIII ст. Ракако ў скульптуры. Дробная пластыка Э.М.Фальканэ. “Купальшчыца”, “Алегорыя музыкі”, “Пагражальны амур”. Асветніцкі Класіцызм. Міфалагічныя і жанравыя статуі, надмагіллі Ж.Б.Пігаля. Жанравы накірунак у скульптуры Ж.Б.Лемуазана. Ж.А.Гудон – стваральнік партрэтнай энцыклапедыі дзеячоў эпохі Асветы. Скульптурныя партрэты Дзідро, Русо, Глюка, Вашынгтона. Статуя “Вальтэр”. Арыентацыя на антычнае мастацтва ў скульптуры мяжы XVIII – XIX стст. А.Канова. Статуі міфалагічных герояў (“Амур і Псіхея”, “Персей”), партрэты і надмагіллі (статуя Напалеона I, Паліна Баргезэ ў выглядзе Венеры).

Класіцызм як стыль афіцыйных пабудоў у архітэктуры XVIII ст. Ж.-А.Габрыель: плошча Згоды ў Парыжы, Малы Трыанон у Версальскім парку.

Творчасць Ж.-Ж.Суфло. Сабор святой Жэнеўевы. “Папяровая архітэктура” К.Н.Леду.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ракако. Кераміка. Вытворчасць паліванага ганчарнага посуду, фаянсу, фарфору. Імкненне да перайманні кітайскіх традыцый. Два буйныя керамічныя цэнтры: Руан, Страсбург. Вядучае месца Францыі ў вытворчасці фарфора. Венсенская і Северская мануфактуры. Выкарыстанне шкла ў аздабленні інтэр’ераў. Багемскае шкло. Францыя – цэнтр ювелірных вырабаў. Апрацоўка металаў і дрэва. Французскае ткацтва. Дэкаратыўнае мастацтва Класіцызму. Кераміка: тэракотавыя статуэткі, антычныя сюжэты ў фарфоравых вырабах. Французскае шкло: “багемскі стыль”. Каралеўская мануфактура ў Сэн-Луі. Ювелірнае майстэрства. Вырабы з металаў. Медальернае мастацтва Ж.Дзювівье. Класічныя формы ў мэблі. Французская тканіна. Творчасць Філіпа дэ Лассаля. Мануфактура Жуі.

***Мастацтва Расіі.*** Пятроўскія рэформы і іх адлюстраванне ў мастацве. Развіццё ідэй асветніцтва. Жывапіс XVIII ст. Станаўленне жанру партрэт. Творчасць І.Н.Нікіціна. Рэалізм вобразаў. “Напольны гетман”, “Авальны партрэт Пятра І”. Партрэты І.Я.Вішнякова. “Партрэт Галіцыны”. Рэалістычныя партрэты А.А.Антропава. “Парадны партрэт Пятра ІІІ”. Выяўленне людзей трэцяга саслоўя ў партрэтах І.Аргунова. “Партрэт невядомай сялянкі ў рускім касцюме”. Жывапіс Екацярыненскага Класіцызму. Ракако ў жывапісу Ф.С.Рокатава. Асаблівасці каляровага вырашэння. “Партрэт Струйскай”, “Партрэт Сувораўцавай”. Выяўленне індывідуальнага ў партрэтах Д.Г.Левіцкага. “Партрэт Хаванскай і Трушчова”. Парадныя партрэты Д.Г.Левіцкага. “Парадны партрэт Екацярыны ІІ”. “Партрэт Дзямідава”. Партрэты В.Л.Баравікоўскага. “Партрэт Лабухіной”, “Сямейны партрэт Ганны Іванаўны Безбародка з дачкамі”, “Партрэт Куракіна”. Гістарычны жанр у творчасці А.П.Ласенка. “Развітанне Гектара з Андрамахай”.

Скульптура. Парадныя і камерныя скульптурныя партрэты Ф.Шубіна (статуя Екацярыны ІІ, Партрэт А.Галіцына). Творчасць Э.Фальканэ. Конны манумент Пятра І у Санкт-Пецярбурзе. Скульптура М.Казлоўскага. Помнік А.Сувораву. Творчасць К.Б.Растрэлі. Траянская калона. Бюст Пятра І. Бронзавая скульптура Ганна Іаанаўна з парабчонкамі.

Горадабудаўніцтва і архітэктура Пятроўскіх часоў. Будаўніцтва Пецярбурга. Творчасць італьянскага архітэктэктара Д.Трэзіні ў Пецярбурзе (Петрапаўлаўскі сабор, Летні палац Пятра І, будынак дванаццаці калегій). Садова-паркавае мастацтва. Летні сад, Пецяргофскія каскады (арх. Лэблон). Пецярбургскае барокка. Творчасць Ф.Расрэллі (Екацярыненскі палац у Царскім сяле, Зімовы палац, Смольны манастыр у Пецярбурзе). Мастацтва інтэр’еру. Вялікая зала Екацярыненскага палацу. Рускі Класіцызм. Творчасць В.Бажэнава (дом Пашкова ў Маскве). М.Казакоў. Маскоўскі універсітэт. Творчасць замежных архітэктараў у Расіі. Ч.Камерон. “Зялёная сталовая” і “Агатавая комната” у Екацярыненскім палацы; Кітайскі мостык у Царскім сяле, ансамбль Паўлаўска. Д.Кварэнгі (Канцэртная зала ў Екацярыненскім парку, Аляксандраўскі палац у Царскім сяле).

# Тэма 11. Мастацкая культура XIX стагоддзя

Новыя формы культурнага жыцця. Рэакцыя пратэсту супраць асветніцкіх прынцыпаў і спосабаў змянення грамадства і чалавека. Лібералізм. Стылёвы воблік эпохі. Разнастаўнасць мастацкіх накірункаў.

***Рамантызм.*** Гістарычная абумоўленасць узнікнення рамантызму. Рамантычнае ўспрыманне чалавека. Ідэя самабытнай індывідуальнасці. Духоўны свет чалавека як галоўная тэма творчасці рамантыкаў. Пафас грамадзянскасці, барацьбы, пратэсту супраць зла. Зварот да народнай творчасці.

Стыль ампір у архітэктуры і скульптуры. Адлюстраванне велічнасці і гераічнасці ў дойлідстве. Трыумфальная арка на Плошчы Звязды ў Парыжы (арх. Ж.Шальгрэн). Афармленне інтэр’ераў у стылі ампір.

Жывапіс рамантызму. Аналіз духоўнага свету чалавека ў творчасці Ф.Гойі. Партрэты Ф.Гойі. “Сям’я караля Карла IV”, партрэт Гільмардэ, партрэт Ізабэллы Кобас дэ Порсел. Тэма пратэсту ў творах Ф.Гойі. “Растрэл паўстанцаў у ноч на 3 мая 1808 года”. Вытокі рамантызму ў выяўленчым мастацтве. З’яўленне рамантычных вобразаў у карцінах Ж.Л.Давіда (“Напалеон на перавале Сэн-Бернар”). Каляровая і кампазіцыйная рэвалюцыя ў жывапісу. Творчасць Т.Жэрыко. “Афіцэр конных стралкоў перад атакай”, “Паранены кірасір”, “Плот Мядузы”. Тэма вызваленчай барацьбы ў творах Э.Дэлакруа. “Разня на Хіосе”, “Выкраданне Рэвекі”, “Свабода, вядучая народ”.

Рамантызм у Расіі. Спалучэнне рамантызму з рэалістычнымі рысамі ў жывапісу. Партрэты А.А.Кіпрэнскага. Перадача пачуццяў у партрэце А.С.Пушкіна. Партрэтная творчасць В.А.Трапініна (“Кружаўніца”, партрэт сына, партрэты А.С.Пушкіна, “Аўтапартрэт”). Адлюстраванне ўнутранага свету герояў і драматызм канфліктаў у творчасці К.П.Брюлова. “Апошні дзень Пампеі”. Партрэтны жывапіс К.П.Брюлова (“Жанчына-коннік”, “Партрэт А.Стругоўшчыкава”, “Партрэт І.Крылова”, “Аўтапартрэт 1848 г.”). Гістарычны жывапіс А.А.Іванава. “З’яўленне Хрыста народу”.

***Рэалізм.*** Асаблівасці сацыяльна-палітычнага жыцця. Буржуазна-дэмакратычныя рэвалюцыі 1848 – 1849 гг. Чарцізм. Крытыка буржуазнай рэчаіснасці ў выяўленчым мастацтве. Барбізонская школа жывапісу. Творчасць Т.Руссо, Ж.Дзюпрэ і Ф.Дабіньі. Сатырычная графіка А.Дамье: “Карыкатура на караля Луі Філіпа”, “Гарганцюа”. Палітычныя літаграфіі (“Свабода друку”, “Вуліца Транснанэн”, серыя “Людзі юстыцыі”). Гуманізм у творчасці А.Дамье (серыі “Прачкі”, “Вагоны”, “Дон Кіхот”, “Аматары эстампу”). Сялянская тэма ў карцінах Ф.Мілле. Абагуленыя вобразы сейбітаў, веяльшчыкаў як карміцеляў чалавецтва. “Веяльшчык”, “Сейбіт”, “Зборшчыцы каласоў”, “Чалавек з матыгай”. Лідар французскага рэалізму – Г.Курбэ. “Драбільшчыкі камянёў”, “Добры дзень, спадар Курбэ”, Майстэрня мастака”. “Пахаванне ў Арнане”. Майстар французскага пейзажу – К.Каро. “Воз сена”, “Парыў ветру”, “Замак Пьерфон”.

Рускі рэалізм. Жанравыя карціны і партрэты П.А.Федотава. “Сватаўство маёра”, “Снеданне арыстакрата”, “Свежы кавалер”. Глыбокі лірызм партрэтаў П.А.Федотава (партрэты Е.Флуга, Н.Ждановіч). Скульптура. М.Мартас. Помнік

Мініну і Пажарскаму. П.Клодт. Скульптурныя групы на Анічкавым мосце ў Санкт-Пецярбурзе. Архітэктура Пецярбурга. Грамадскае дойлідства. Адміралцейства А.Захарава. Творчасць К.Россі (будынак Галоўнага штабу, Міхайлаўскі палац, Александрыйскі тэатр). Культавая архітэктура. Казанскі сабор А.Вараніхіна. Творчасць А.Манферрана (Ісакіеўскі сабор, Александрыйская калона).

***Імпрэсіянізм.*** Адмаўленне ад пераймання канонаў прыгажосці. Новае бачанне свету, заснаванае на непасрэдным зрокавым уражанні,назіранні прыроды. Колер і святло як зменлівыя элементы рэальнага свету. Новая тэхніка жывапісу. Творчасць Э.Манэ. “Снеданне на траве”, “Алімпія”, “Флейтыст”, “Балкон”, “Партрэт Эміля Заля”, “Бар у Фолі-Бержэр”. Уплыў традыцый Барбізонскай школы на творчасць К.Манэ (“Снеданне на траве”). Пейзажны жывапіс К.Манэ (“Уражанне. Усход сонца”, “Бульвар Капуцынак у Парыжы”, “Скалы ў Бэль Іль”, “Чайкі”). Серыі карцін “Стог сена”, “Руанскі сабор”, Гарлачыкі”. К.Пісарро. “Бульвар Монмартр у Парыжы”. Лёгкасць і артыстычнасць пейзажаў А.Сіслея (“Мароз у Лувесьене”, “Лодка ў час паводкі”, “Плошча ў Аржанцее”). Творчасць Э.Дэга. Адмаўленне ад пленэру. Адлюстраванне роднага гораду: сцэны скачак, балет, музыканты. “Балетны клас”, “Танцаўшчыца ў фатографа”, Абсэнт”. Партрэты А.Рэнуара. “Партрэт актрысы Жанна Самары”, “Дзяўчына з веерам”.

***Постімпрэсіянізм.*** Новы падыход да тэматыкі ў творчасці Ван Гога, Гагена, Сезана.  Два перыяды творчасці Ван Гога: галанскі і французскі. Драматызм, экспрэсіўны характар выканання твораў, каляровая гама. “Сейбіт”, “Жнец”, “Ткач”, “Едакі бульбы”. Пейзажы Ван Гога (“Чырвоныя вінаграднікі”, “Дарога ў Аверы пасля дажджу”). Аб’ём, структара, канструкцыя як аснова мастацкай мовы П.Сезана. Уплыў творчасці П.Сезана на выяўленчае мастацтва ХХ ст. “Берагі Марны”, “Ігракі ў карты”, “Нацюрморт з садавінай”, “Купальшчыцы”, “Аўтапартрэт”. Творчасць П.Гагена. Манументальная і дэкаратыўная выразнасць карцін. Асаблівасці кампазіцыйнага вырашэння і каляровай гамы. Таіцянскі перыяд творчасці. “Таіцянскія пастаралі”. Творчасць А. дэ Тулуза-Латрэка. Жывапісныя творы. Графіка: афіша, плакат, рэклама. Пуанцілізм (неаімпрэсіянізм, дывізіянізм). Асаблівасці тэхнікі жывапісу. Дэкаратыўнасць кампазіцый. Ж.Сёра і П.Сіньяк.

Скульптура імпрэсіянізму і постімпрэсіянізму. Мастацтва “жывапіснай лепкі” у скульптуры А.Радэна. “Мысліцель”, “Старуха”, “Закаханая”. Помнік Бальзаку ў Парыжы. “Вароты Пекла”. А.Радэн – майстар групавой скульптуры. “Грамадзяне Кале”.

***Крытычны рэалізм у Расіі.*** Ідэі рэвалюцыйных дэмакратаў і іх адлюстраванне ў мастацтве. Мастацтва Перадвіжнікаў. Пошук духоўнага ідэалу ў карцінах І.М.Крамскога (“Хрыстос у пустыні”). Дакладнасць выканання партрэтаў І.М.Крамскога (партрэты Л.Талстога, П.Трэцьякова, А.Некрасава, “Невядомая”, “Безуцешная бяда”). Бытавы жанр у жывапісу. Творчасць В.Перова. “Сялянскі крыжовы ход на Пасху”, “Провады нябожчыка”, “Апошні кабак ля заставы”. Партрэты В.Перова (партрэты пісьменнікаў Астроўскага і Дастаеўскага). Новая тэматыка ў жывапісу: вобраз рабочага ў карціне

Н.Ярошанка “Качагар”. Творчасць І.Я.Рэпіна. Адлюстраванне асобы ў гістарычным жывапісу І.Я.Рэпіна. “Бурлакі”, “Крыжовы ход у Курскай губерніі”, “Іван Жахлівы і яго сын Іван”, “Не чакалі”. Партрэтны жанр у жывапісу І.Я.Рэпіна (партрэты Мусаргскага, Л.Талстога, Стасава, П.Трэцьякова). Гістарычны жывапіс В.І.Сурыкава. “Баярыня Марозава”, “Раніца стралецкай казні”, “Меншыкаў у Бярозаве”. Пейзажны жывапіс передвіжнікаў. Лірычныя пейзажы А.К.Саўрасава. “Від на Крэмль у нянасце”, “Ласіны востраў у Сакольніках”, “Магіла над Волгай”, “Грачы прыляцелі”. Ф.Васільеў. “Адліга”. Эпічнае ўспрыманне прыродым на карцінах І.І.Шышкіна. “Жыта”, “Лясныя далі”, “Дубы”, “Сосны, асветленыя сонцам”, “Раніца ў сасновым лесе”. Лірычныя пейзажы І.І.Левітана. “Вячэрні звон”, “Сакавік”, “Вечар на Волге”, “залатая восень”.

***Эклектыка. Мадэрн.*** Новыя патрабаванні да архітэктуры XIX ст. Арыентацыя на ўспрыманне архітэктуры ў працэсе руху. Новыя формы ў дойлідстве: вакзалы, заводы, фабрыкі, канторы, універмагі, шматкватэрныя дамы. З’яўленне новых будаўнічых матэрыялаў. Крыштальны палац у Лондане (арх. Дж.Пэкстан). Будынак бібліятэкі Сант-Жэневьев у Парыжы (арх. А.Лабруст). Эйфелева вежа ў Парыжы (арх. Г.Эйфель). Два этапы эклектыкі: рамантычны і гістарычны. Оперны тэатр у Парыжы (арх. Шарль Гарнье).

Першаснае значэнне архітэктуры ў фарміраванні стылістычных асаблівасцей мадэрну. Выкарыстанне новых канструктыўных сродкаў, свабодная планіроўка, своеасаблівы архітэктурны дэкор. Творчасць Х.Ван дэ Вэльдэ (Бельгія), Й.Ольбрыха (Аўстрыя), А.Гаудзі (Іспанія), Ф.Шэхтэля (Расія). Асаблівасці дэкаратыўнага мастацтва. Творчасць Х.Обрыста, У.Морыса. Вытворчасць мэблі, шпалераў, вітражоў.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва XIX ст. Стварэнне Імператарскай школы мазаікі ў 1804 г. у Францыі. З’яўленне абояў. Новыя матывы ў керамічных вырабах. Венецыянскае шкло. Творчасць Э.Галле ў стылі “ар-нуво”. Ювелірныя вырабы. Апрацоўка металаў. Новыя формы ў мэблі. Ткацтва. Ліонскі шоўк. Набіўная тканіна.

## Тэма 12. Мастацтва XX – пачатку XXI стагоддзя

Прамысловая рэвалюцыя. Палітычныя і сацыяльныя рэформы. Дасягненні навукі. Адмаўленне канонаў і нормаў мінулых традыцый культуры. Мадэрністычныя накірункі ў мастацтве.

***Еўрапейскае і амерыканскае мастацтва.*** Фавізм. Узнікненне групы. Паходжанне назвы. Асаблівасці жывапісу: яркія, чыстыя колеры, моцныя мазкі, плямы, скажэнне форм. Колер як галоўны сродак выявы. Жывапіс А.Дзерэна, М. дэ Вламінка, Рауля Дзюфі, А.Марке, Ж.Руо. Анры Маціс – лідэр фавізму. “Чырвоны пакой”, “Нацюрморт з чырвонымі рыбкамі”, “Танец”, “Музыка”.

Кубізм. Дэфармацыя формы, абмежаванае кола матываў. П.Пікассо і Ж.Брак як заснавальнікі накірунку. Тры перыяды кубізму: сезанаўскі, аналітычны, сінтэтычны. Адлюстраванне шэрагу праблемных адносінаў (паміж рэальнасцю і спосабам яе адлюстравання, паміж моўнымі знакамі розных узроўней, паміж візуальным фактам і вобразам думкі) у творах кубістаў. Лінія і

плоскасць як галоўныя сродкі выразнасці. Выкарыстанне прыёма “калаж”. Творчасць Х.Грыса, Р.Дэлонэ, Ф.Лежэ. Праламленне ідэй кубізму ў творах П.Пікассо. “Блакітны” (“Галеча”, “Трагедыя”, “Адрынутая”) і “ружовы” (“Сям’я вандроўных камедыянтаў”, “Дзяўчына на шары”) перыяды творчасці. Пано “Герніка”. Малюнак “Голуб міра”.

Экспрэсіянізм. Імкненне да каларыстычнага жывапісу. Адмаўленне ад колера-ценевой мадэліроўкі формы, імкненне да плоскаснасці. Значэнне твору “Крык” Э.Мунка ў станаўленні экспрэсіянізму. Аб’яднанні “Мост”, “Сіні коннік”, “Бура”. Трагедыйнае ўспрыманне рэчаіснасці ў творах Э.Л.Кірхнера, Э.Нольдэ, О.Какошка. Антываенная тэматыка ў графіцы К.Кольвіца і О.Дзікса. Серыя афортаў О.Дзікса “Вайна”.

Футурызм. Узнікненне накірунку ў Італіі. Першы маніфест футурыстаў (Т.Марынэцці). Адлюстраванне ў творах узросшага тэмпу жыцця. Усхваленне прыгажосці хуткасці. Творчасць Дж.Балла. Карціны Дж.Северыні (“Дамы, святло, неба”, “Дынамізм ровэра”).

Дадаізм. Выкарыстанне тэхнікі “калаж” у жывапісу. Творчасць М.Дзюшана. Прамысловыя вырабы (сушылка для бутэлек, веласіпеднае кола на табурэтцы).

Неарэалізм. Дынамічная кампазіцыя, энэргічная прапрацоўка аб’ёма, насычаныя колеры як характэрныя рысы неарэалістычных жывапісу і графікі. Вядучы прадстаўнік накірунку – Р.Гутуза. Драматычная экспрэсія і абагуленасць форм у карцінах Р.Гутуза. Адлюстраванне гераічных сцэн народнага жыцця, рэвалюцыйнай барацьбы (“Растрэл”, “Натоўп”, “Кошык, клешчы і малаток”). Вырашэнне вострых сацыяльных праблем у творы “Захоп пустуючых зямель у Сіцыліі”. Графічная серыя “З намі бог!”. Тэма моладзі ў карціне “Бугі-вугі ў Рыме”.

Сюррэалізм. Уплыў філасофіі А.Бергсона і З.Фрэйда на мастацтва сюррэалізму. Ранні перыяд сюррэалізму ў творчасці Дж. дэ Кірыка, М.Шагала, М.Эрнста. Творы Х.Міро, І.Тангі. Два напрамкі сюррэалізму. Адмаўленне ад традыцыйных сродкаў выразнасці, выкарыстанне прыёмаў “дэкалаж”, “фратаж”, “фюмаж”, “бутэлізм”. М.Апенгейм. “Футравы чайны сервіз”. Звяртанне да традыцыйных прыёмаў, натуралістычнае ўзнаўленне асобных бакоў рэчаіснасці ў творчасці С.Далі, Р.Магрыта, П.Дэльво.

Абстракцыянізм (беспрадметнае мастацтва). Кропка, лінія, плоскасць, колер як асноўныя сродкі абстрактнага жывапісу. Значэнне кубізму, футурызму і дадаізму ў станаўленні абстракцыянізму. В.Кандзінскі – заснавальнік накірунку. Акварэлі В.Кандзінскага. Супрэматызм. “Чорны квадрат на белым фоне”, “Белы квадрат на белым фоне” К.Малевіча. Творчасць П.Мандрыяна.

Поп-арт (папулярнае мастацтва). Масавы і рэкламны характар мастацтва. Прадметны змест у мастацтве як антыпод абстракцыянізму. Творчасць Р.Раушэнберга, Р.Ліхтэнштэйна, Э.Уорхала, К.Ольдэнбурга. Гіпсавыя вырабы Дж.Сігела.

“Ап-арт” (аптычнае мастацтва). Уздзеянне геаметрычных форм і каляровых кантрастаў на чалавечае вока. Стварэнне аптычных ілюзій. Творчасць В.Вазарэллі.

Кінэтычнае мастацтва. Творчасць Г.Юккера. Механічная скульптура Тэнглі. “Эўрыка”. “Цыклоп”. Гіперрэалізм. Мастацтва дзеяння (перформенс, хэпінінг). Лэнд-арт. Канцэптуальнае мастацтва. Прымітывізм (наіўнае мастацтва). Творчасць А.Руссо, Н.Пірасманашвілі.

Манументальны жывапіс Мексікі. Адлюстраванне гісторыі народаў Мексікі ў творчасці Д.Рыверы. Дынаміка форм, кантрасты фарбаў ў жывапісу Д.Сікейраса. Манументальныя роспісы ў Мехіка (Палац зграбных мастацтваў, клуб прафсаюзаў электрыкаў, “Поліфорум”). Рэвалюцыйны пафас, экспрэсіўная манера выканання як адметныя рысы твораў Х.К.Ароска (роспісы ў Мехіка, Гвадалахары, ЗША).

Фотамастацтва. Узнікненне фатаграфіі ў XIX ст. Ж.Ньепс як заснавальнік фотамастацтва. Дагератыпы. Стварэнне першага аб’ектыву. Пераварот у фатаграфіі ў 1913 г.: стварэнне 35-ці міліметровай фотакамеры. Рэпартажная фатаграфія XX ст. Фотаапарат “Лейка”.

Скульптура XX ст. Класічны ідэал у творчасці А.Майёля. Імкненне да гармоніі, ураўнаважанасць мас і аб’ёмаў. “Памона”, “Вясна”, “Ноч”, “Помнік О.Бланку”, “Помнік П.Сезану”. Драматызм вобразаў у творах Э.А.Бурдэля. “Геракл”. Дэфармацыя формы з мэтай узмацнення выразнасці ў творах Э.Барлаха. Творчасць Г.Мура (“Маці і дзіця”). Італьянская скульптура. М.Марыні. “Коннік”. Бронзавыя рэльефы і круглая пластыка Дж.Манцу. “Брама смерці” сабора святога Пятра ў Рыме. Творчасць А.Джакамецці. Роля матэрыяла ў скульптурных творах К.Бранкузі. Спрошчанасць, цякучасць форм у творах Х.Арпа. Кубістычная скульптура А.Ларана і Ж.Ліпшыца. Футурызм у скульптуры. Творчасць У.Баччоні. Уплыў кубізму і экспрэсіянізму на творчасць О.Цадкіна. Помнік “Разбураны горад” у Роттэрдаме. Рухаючаяся скульптура А.Колдэра. Фантан “Ртутная крыніца”.

Асаблівасці архітэктуры XX ст. Амерыканская Чыкагская школа. Канструктыўныя і функцыянальныя праблемы высотнага будаўніцтва ў творчасці Л.Саллівэна. Уэйнрайт Білдзінг у Сэнт-Луісе. Гаранці Траст Білдзінг у Буффало. Школа “Баухауз” у Германіі. Асновы функцыяналізму. Творчасць В.Гропіуса. Будынак “Баухауза” у г.Дэсау. Творчасць Міс ван дэр Роэ. Сігрэм-Білдзінг у Нью-Ёрке. Развіццё горадабудаўніцтва. Тэрытарыяльнае планаванне. Французская архітэктура XX ст. Творчасць Ле Карбюзье. Праект “Прамянёвага гораду”. Дом у Марсэлі. Капэла ў Раншане. Вольнае рассяленне сярод прыроды як асноўны прынцып архітэктуры Ф.Ллойда Райта. “Дом над вадападам”. Музей Гуггенхейма ў Нью-Ёрке.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва XX ст. Кераміка. Капенгагенскі фарфор. Дацкі завод “Бінг і Грёндаль”. “Венера” К.Нільсана. Мастацтва майё-лікі ў Германіі. Кераміка П.Пікассо. Шкло. Дэкаратыўны барэльеф “Гісторыя вогнішча”. Шкляныя заводы Бельгіі. Абстрактныя матывы ў вітражным мастацтве. Строгасць форм і пошук гарманічных прапорцый у ювелірным майстэрстве. Апрацоўка металаў. Агароджа наземных уваходаў у Парыжскае метро. Вырабы з дрэва. Стыль “ар-нуво”. Цікавасць да формы і аб’ма ў драўлянай мэблі Ж.-Э.Рульмана. Мэбля краін Паўночнай Еўропы (Л.Міс ван дэр Роэ, М.Брэйер). Ткацтва. Уплыў экзатычнага мастацтва на дывановыя

вырабы. Абстрактны дэкор дываноў. Шпалернае мастацтва. Абюссонская школа (Францыя).

***Рускае мастацтва XX ст.*** Новыя стаўленне да праблемы чалавека і грамадства ў мастацтве. Росквіт партрэтнага мастацтва, графікі і сцэнаграфіі. Партрэт пачатку XX ст. Творчасць В.Серова. “Дзяўчына з персікамі”, “Лета”, партрэты П.Шчарбатавай, І.Рубінштэйн, М.Ермолавай. Манументальна-дэкаратыўнае пано гістарычнага зместу “Выкраданне Еўропы”. Творчасць М.Врубеля. Скульптуры “Мізгір”, “Купава”. Афармленне спектакляў Маскоўскай прыватнай оперы С.І.Мамантава (“Садко”, “Казка пра цара Салтана” Рымскага-Корсакава). Рамантычныя традыцыі, алегорыя ў мастацтве М.Врубеля (“Дземан”, “Дземан паверavailable”). Адлюстраванне чалавечых пакут у творах “К начы”, “Бэз”. Псіхалагічная выразнасць у партрэтах мастака (“Партрэт Н.Забэла-Врубель”, “Партрэт В.Брюсава”, “Аўтапартрэт”).

Аб’яднанне мастакоў “Мир искусства”. Пратэст супраць акадэмізму і мастацтва перадвіжнікаў. А.Бенуа і С.Дзягілеў – заснавальнікі аб’яднання. Выставы ў Піцярурзе і Маскве. Прынцып “мастацтва дзеля мастацтва”. Праблема сінтэза мастацтва ў межах кніжнай графікі і тэатральна-дэкаратыўнага мастацтва. Дэкаратыўная стылізацыя ў творах мастакоў. Асветніцкія задачы аб’’днання. Творы К.А.Сомава, М.К.Рэрыха, Б.М.Кусто-дзіева. Дзейнасць аб’яднанняў “Бубновы валет”, “Асліны хвост”, “Блакітная ружа”. АМРР. Кукрыніксы. Накірунак соцрэалізм. Творы А.Лакціонава (“Забяспечаная старасць”, “Пісьмо з фронту”). Ю.Піменаў. “Новая Масква”, “Вокны”. “Суровы стыль” у творчасці В.Папкова. “Паўночная часоўня”, “Паўночныя ўдовы”.

Руская архітэктура XX ст. Адлюстраванне ідэй Рэнесансу ў творчасці І.Жалтоўскага. Панаванне стылёвых тэндэнцый неакласіцызму ў перадваенныя гады. Асабняк Полаўцава на Каменным востраве, праект планіроўкі і забудовы вострава Голадай у Санкт-Пецярбурзе (арх. І.Фамін). Накірунак канструкты-візм. Творчасць братоў Весніных (Днепрагэс, Палац культуры аўтазавода ў Маскве). Палац з’ездаў у Маскве (арх. М.Пасохін). Маскоўскае і Пецярбургскае метро. Творчасць А.Шчусева: Маўзалей У.І.Леніна. Грамадскае дойлідства. Кіеўскі вакзал у Маскве (арх. І.Рэрберг).

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Ткацтва. Вырабы камбінату “Чырвоная ружа”. Мастацтва габілену ў прыбалтыйскіх краінах. Дываны Малдавіі, Азербайджана, Грузіі, Арменіі. Вышыўка Узбекістана. Ювелірнае майстэрства. “Северная чернь”. Растоўская фініфць. Кераміка. Падмаскоўная Гжэль. Рыжскі фарфорава-фаянсавы завод. Ленінградскі фарфоравы завод. Эвалюцыя шкляных вырабаў у XX ст. Лакавая мініяцюра. Хахлама.

